


# ПІНСК.

# Палеская жамчужына

Пасля вызвалення Заходняй Бела- аднавіць прафесійны тэатр. Яму пасля

Пасля вызвалення Заходняй Беларусі восенню 1939 года ў Пінску быў створаны Палескі абласны драматычны тэатр. Тады ў горад над Пінай перавялі Заслаўскі калгасна-саўгасны тэатр. Аднавіў тэатр сваю працу ў 1946 годзе ўжо ў рангу Пінскага абласнога драматычнага тэатра.

Згодна з пастановай Савета Міністраў БССР, у 1954 годзе Пінскі абласны драматычны тэатр перавялі ў Магілёў. Пінск пазбавілі статусу абласнога цэнтра. Будынак тэатра з глядзельнай залай на 460 месцаў перадалі гарадскому Дому культуры. Тут арганізавалі самадзейную трупу, якая ўжо праз некалькі гадоў атрымала званне народнага аматарскага калектыву, а з 1992 года рэарганізавалася ў паўпрафесійны тэатр-студыю «Дыяген».

Сваёй дзейнасцю «дыягенаўцы» даказалі, што тэатральнае мастацтва ў горадзе запатрабавана і прыйшла пара аднавіць прафесійны тэатр. Яму пасля рэканструкцыі перадалі старажытны будынак гарадскога кінатэатра, які шмат гадоў не выкарыстоўваўся па прызначэнні, – помнік архітэктуры пачатку XIX стагоддзя, які ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

Першы дзень нараджэння Палескі драматычны тэатр адзначыў 14 сакавіка 2006 года. Ён размясціўся ў гістарычным будынку найстарэйшага пінскага кінатэатра «Казіно», пабудаванага ў 1911 – 1912 гадах у стылі мадэрн. Драмтэатр стаў 29-м прафесійным дзяржаўным тэатрам у краіне. Рэпертуар Палескага драматычнага тэатра выклікае здзіўленне нават у некаторых сталічных тэатраў. Раз на паўтара месяца жамчужына пінскай культуры радуе прыхільнікаў прэм'ерай. На афішах – класіка, сучасная замежная драматургія, творы беларускіх аўтараў.

